мясцовай інтэлігенцыі і быў складзены з музычнай і драматычнай секцый. Музычная секцыя ў сваім складзе мела квартэт і сімфанічны аркестр. У кожным сезоне (з кастрычніка па май) праходзілі 20-30 музычных і тэатральных вечарын, большая частка якіх была праграмная. І, нарэшце, важнай падзеяй музычнага жыцця горада было адкрыццё ў 1915 годзе Віцебскага аддзялення Рускага музычнага аб'яднання і музычных класаў пры ім.

Не адставаў у сваім музычным развіцці ад іншых беларускіх гарадоў і Магілёў. У горадзе даволі часта выступалі групы гастралёраў, аркестры, знакамітыя выканаўцы. У Магілёве актыўна вяла работу мясцовая аматарская музычна-грамадская арганізацыя — Літаратурна-музычны драматычны гурток. Намаганнямі гэтага гуртка ў гарадскім тэатры былі пастаўлены сцэны і акты з вядомых опер.

У апошняй чвэрці XIX—пач. XX ст. падобныя музычныя, літаратурна-артыстычныя таварыствы і іншыя культурна-асветніцкія аб'яднанні адкрываліся ў многіх гарадах і невялікіх мястэчках Беларусі. Так, яны існавалі ў Нясвіжы, Полацку, Дзвінску, Баранавічах, Брэсце, Вілейцы. Усе гэтыя таварыствы мелі розныя назвы, але галоўная мэта іх дзейнасці была адна і тая ж — развіццё музычнай культуры беларускіх гарадоў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Наканечная А.П.,**
*суіскальнік кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры*

## СТАРОНКІ МУЗЫЧНАГА ЖЫЦЦЯ ПОЛАЦКАГА КАДЭЦКАГА КОРПУСА

Мэта дадзенага артыкула — на падставе архіўных дакументаў, літаратурных матэрыялаў і звестак з перыядычнага друку асвятліць пытанні музычнага выхавання

на прыкладзе пастаноўкі выкладання спеваў у Полацкім кадэцкім корпусе ў 2-й палове XIX — пачатку XX ст., а таксама даць некаторае ўяўленне аб правядзенні вольнага часу выхаванцамі.

Полацкі кадэцкі корпус з часу сваёй арганізацыі ў 1835 г. вырашаў задачы агульнаадукацыйнай і пачатковай ваеннай падрыхтоўкі, з'яўляючыся першым звяном у адукацыйнай падрыхтоўцы афіцэраў. Заняткі ў кадэцкім корпусе праводзіліся ў адпаведнасці з "Агульнай праграмай і інструкцыямі для выкладання вучэбных прадметаў у кадэцкіх корпусах". Укладальнікі гэтага дакумента строга прытрымліваліся прынцыпаў выхавання моладзі ў духу праваслаўя, самадзяржаўя і народнасці, якія лічыліся асноўнымі для ўсіх тыпаў школ таго часу.

Асноўная ўвага ў корпусе накіроўвалася на ваенна-фізічнае і рэлігійна-маральнае выхаванне кадэтаў, а затым ужо на агульнаадукацыйную падрыхтоўку. Таму музычнае выхаванне ў кадэцкім корпусе, які адносіўся да Галоўнага штаба (упраўлення) ваенна-навучальных устаноў, не набыло такога характару, як гэта назіралася ў агульна-адукацыйных школах іншых ведамстваў. Адпаведна заняткі спевамі і навучанне ігры на музычных інструментах не сталі абавязковымі ў корпусе і праходзілі ў вольны ад навучання час.

У адпаведнасці з "Агульнай праграмай аб размеркаванні часу і настаўленні для вядзення пазакласных заняткаў у кадэцкіх корпусах" навучанне спевам павінна было садзейнічаць:

— развіццю музычнага слыху выхаванцаў;

— набыццю першапачатковых ведаў па элементарнай тэорыі музыкі;

— выкананню богаслужбовых песнаспеваў і малітваў, а таксама харавых твораў свецкага характару.

Галоўная мэта навучання спевам бачылася ў развіцці голасу і слыху навучэнца, таму спевам навучаліся ўсе кадэты першых двух класаў (курс навучання ў корпусе

складаў сем гадоў) без уліку іх галасавых і слыхавых здольнасцей. Вызваленне ад урокаў дапускалася пры поўнай адсутнасці музычных дадзеных і пры заключэнні ўрача.

Выкладанне спеваў вялося па "Праграме спеваў і элементарнай тэорыі музыкі ў двух малодшых класах", дзе ўвесь вучэбны матэрыял быў разлічаны на два ўрокі на тыдзень.

На першых занятках вучні знаёміліся са спевамі царкоўных малітваў і свецкіх песень. Паралельна ішло выкладанне тэорыі музыкі. Тэарэтычныя звесткі замацоўваліся шляхам разбору развучваемых у класе песень.

Кадэты , якія валодалі слыхам, да і пасля мутацыйных змяненняў голасу спявалі ў агульным хоры. Па ротах складаўся спіс спяваючых у хоры, акрамя таго, быў спіс "часова адпачываючых".

На пачатку навучальнага года настаўнік спеваў праводзіў сярод кадэтаў агульнае размеркаванне па галасах, вызваляючы тых, чые галасы перажывалі мутацыйны перыяд. На пачатку другога паўгоддзя настаўнік зноў правяраў мутацыйныя галасы.

У "Агульнай праграме аб размеркаванні часу..." адзначалася, што на агульны хор не трэба глядзець як на хор канцэртны: "Ён створаны не столькі для мастацкага выканання музычных п'ес, колькі ў мэтах чыста педагагічных".

На ўроках не ставілася мэта выконваць складаныя ў музычных адносінах творы. Выкладчык выбіраў такія творы, "якія маглі б выйграць у выкананні вялікімі масамі". Выкладчык павінен быў умець рабіць харавыя пералажэнні асобных твораў для свайго складу спяваючых.

Навучанне праходзіла ў форме калектыўных занятках па групах галасоў (па ротах ці класах), а таксама рэпетыцый агульнага складу хору. Для кожнай групы хору прадугледжваўся не менш за адзін урок на тыдзень.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Агульныя рэпетыцыі вызначаліся па меры неабходнасці і таксама не меней за адзін раз на тыдзень, у залежнасці ад падрыхтоўкі кадэтаў па групах (у асобных ансамблях).

Кадэты з добрымі галасамі складалі царкоўны хор. Цікавы той факт, што пакінуць хор было нельга да таго часу, пакуль "удзел яго (спяваючага.— А.Н.) будзе прызнавацца карысным". Царкоўны хор мог развучваць даступныя ў музычных адносінах творы класічнага рэпертуару і выконваць іх на музычных вечарынах у корпусе. У гэтым выпадку да ўдзелу ў царкоўным хоры прыцягваліся лепшыя спевакі з агульнага хору.

Харавыя заняткі кадэтаў звычайна праходзілі ў суправаджэнні фартэпіяна, скрыпкі ці гармоніума (гармоніка).

Неабходнасць у развіцці пазакласнай работы была выклікана як новымі педагагічнымі задачамі ў сувязі з рэформай народнай адукацыі ў 60-я гады XIX ст., так і пастаянным знаходжаннем у сценах корпуса выхаванцаў.

У пазакласных занятках у корпусе адукацыйныя і выхаваўчыя задачы вызначаліся таксама "Агульнай праграмай аб размеркаванні часу і настаўленні для вядзення пазакласных заняткаў у кадэцкіх корпусах", арганізоўваліся галоўным чынам дзеля таго, каб запоўніць вольны час выхаванцаў.

Магчымасці культуры па арганізацыі вольнага часу ў Полацку былі абмежаваны, хаця начальства корпуса імкнулася зрабіць жыццё кадэтаў як мага больш разнастайным. У час знаходжання на пасту з 1905 г. па 1908 г. начальнік корпуса генерал-маёр А.Ваулін звяртаў увагу на тое, каб "даць кадэтам асаблівыя забавы". Ён надаваў увагу пастаноўцы спектакляў у корпусе, дазваляў удзел у гэтых спектаклях паненак і дам з сем'яў служачых корпуса, наладжваў танцавальныя і касцюміраваныя вечары і балі.

"Усходняя вайна" (1853—1856 гг.) выклікала сярод кадэтаў усеагульны і гарачы ўздым патрыятычных

пачуццяў. Жадаючы аказаць пасільную дапамогу параненым воінам, кадэты з дазволу начальства падрыхтавалі спектакль.

У актавай зале афіцэрскага корпуса выступалі як мясцовыя, так і гастраліруючыя артысты, якія арганізоўвалі літаратурна-музычныя вечары. Так, 16 жніўня 1907 года прайшоў канцэрт харавой капэлы Д.Славянскага, а 19 лістапада таго ж года — канцэрт А.Архангельскага.

Несумненна, заняткі спевамі і музыкай, а таксама культурныя мерапрыемствы ў вольны час дабратворна ўздзейнічалі на выхаванцаў Полацкага кадэцкага корпуса. Яны стваралі своеасаблівую атмасферу разрадкі ў жорсткай дысцыпліне закрытай навучальнай установы (зразумела, не на шкоду вучобе).

**Куніцкая Н.У.,**
*аспірантка кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры*

## СТАНАЎЛЕННЕ ЦЫРКАВОГА МАСТАЦТВА Ў БЕЛАРУСІ Ў XIX СТАГОДДЗІ

У XIX стагоддзі цыркавое мастацтва заявіла аб сабе як аб спецыфічным відзе мастацтва. Яго развіццё ў гэты перыяд працягваецца ў асноўным на шматлікіх кірмашах розных мясцовасцей Беларусі.

У першай палове XIX ст. у Беларусі былі вядомы кірмашы ў Зэльве, Бельску, Кобрыне, Свіслачы, Гродне, Беластоку, Брэсце і інш. Найбольш вядомы былі кірмашы ў Зэльве. Іх называлі Ганнінскімі, таму што афіцыйнае адкрыццё гандлю адбывалася 26 ліпеня, у дзень святой Ганны. Аб кірмашах у Зэльве не раз пісаў П.Баброўскі, вядомы даследчык Гродзеншчыны другой паловы мінулага стагоддзя: “Посередине, на довольно обширной площади,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ